# Легенды аб паходжанні назвы «Хоцімск»

Нямала прыгожых паданняў захоўвае Хоцімшчына — самая ўсходняя ўскраіна Беларусі. І адна з іх — пра паходжанне назвы раённага цэнтра Хоцімска натхніла вядомага беларускага паэта Пятра Прыходзьку, які родам з тутэйшай вёскі Альшоў, на паэму “Дар князёўны”.

У Прыбесяддзі жыў малады парагожы князь Лада. Дачуўся ён, што ў далёкім Гомелі ў князя Радзькі ёсць незвычайнай прыгажосці і гонару дачка Хацім’я. З’яўляючыся нявестай на выданні, нястачы ў жаніхах і кавалерах яна не ведала. Аднак ніхто не быў да спадобы непрыступнай князёўне, бо не бачыла сярод іх вартых сябе. І толькі пасля салодкіх прамоў і палкіх прызнанняў у каханні князя Лады завагалася і растала сэрца ганарліўкі.

Другая версія ўзнікнення назвы цяперашняга раённага цэнтра звязана з гісторыяй заключэння вечнага міру паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай (1686 год), якія дагэтуль увесь час ваявалі. Быццам бы абодва бакі заявілі: “Хочам міру”, пасля чаго самую блізкую да мяжы слабаду і назвалі Хоцімскам.






ДУК «Бібліятэчная сетка Хоцімскага раёна»
Цэнтральная бібліятэка,
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі
213677, Магілёўская вобл., г.п. Хоцімск, пл. Леніна, 5
Электронная пошта: hotimskbib@yandex.ru
Сайт: http://hotlib.mogilev.by

ДУК «Бібліятэчная сетка Хоцімскага раёна»
Цэнтральная бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

# Зямлі маёй мінулы лёс



Хоцімск 2018



# Старонкі гісторыі Хоцімска

**Хоцімск** з’яўляецца адным з старажытнейшых пасяленняў Беларусі. Археалагічныя даследаванні сведчаць аб тым, што на тэрыторыі раёна першыя пасяленцы з’явіліся каля 10 тысяч гадоў таму. З сярэдзіны 1 тысячагоддзя Хоцімшчына ўвайшла ў арэал засялення радавога саюза радзімічаў. Да XIV стагоддзя тэрыторыя раёна ўваходзіла ў Смаленскае княства. У XIV стагоддзі Хоцімшчына ўвайшла ў Мсціслаўскае княства ў складзе Вялікага Княства Літоўскага, а пасля Люблінскай уніі 1569 года Хоцімскія землі апынуліся ў складзе Крычаўскага староства Мсціслаўскага ваяводства Рэчы Паспалітай. Заснаванне паселішча з назвай Хоцімль адбылося паміж 1695 і 1700 гадамі. Упершыню Хоцімск упамінаецца як ***слабада Хоцімль*** ў Мсціслаўскім ваяводстве пад ***1709 годам***. На 1714 год тут было 66 дымоў, дзейнічала царква, працавалі карчма і млын. ***19 кастрычніка 1714 года*** паводле ўнівэрсала канцлера Вялікага Княства Літоўскага Караля Станислава Радзівіла на другім беразе Бесядзі насупраць вёскі Хоцімль у гонар старажытнага князкага роду

У 1724 годзе Радзівілаў атрымаў статус горада. У 1727 годзе ў ім было 148 дымоў, існавала 3 вуліцы (Крычаўская, Альшоўская, Глухая), у 1747 годзе — 116 дымоў і 8 вуліц (Крычаўская,Альшоўская, Старэцкая, Бясовіцкая, Лагавая і інш.), царква Раства Багародзіцы, сінагога, карчма, вязьніца. З сярэдзіны XVIII ст. Радзівілаў — цэнтр Бярозаўскай воласьці Крычаўскага староства.

У выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 год) Радзівілаў апынуўся ў складзе Расейскай імпэрыі ў Клімавіцкім павеце. Расійскія ўлады адразу ж перайменавалі горад ў Хоцімск і падаравалі яго князю Рыгору Пацёмкіну. У складзе Расіі Хоцімск зноў стаў мястэчкам і ўваёшоў у Крычаўскае графства. У 1779 годзе у колішнім Радзівілаве было 63 хрысьціянскія і 42 яўрэйскія дымы, Спаская царква, рымска- і грэка-каталіцкія капліцы, сінагога. На 1844 год Хоцімск налічваў 139 двароў, дзейнічалі 2 царквы і касцёл. У 60-я гады XIX ст. ў Хоцімску было 5 пенькатрапальных прадпрыемстваў, маслабойня, крупадзёрка, вінакурня і бровар. У 1880 годзе ў мястэчку было літоўныя дамы, працавала народнае вучылішча. Паводле вынікаў перапісу 1897 году ў Хоцімску было 416 двароў. 25 сакавіка 1918 года ў адпаведнасці з Трэцяй Устаўной граматай Хоцімск абвяшчаўся часткай Беларускай Народнай Рэспублікі. 1 студзеня 1919 года ў адпаведнасці з пастановай I з'езду КП(б) Беларусі Хоцімск увайшоў у склад Беларускай ССР, аднак 16 студзеня Хоцімск разам з іншымі этнічна беларускімі тэрыторыямі быў уключаны ў склад РСФСР. У 1924 годзе Хоцімск вярнулі БССР, дзе ён стаў цэнтрам раёна. У 1938 годзе Хоцімск атрымаў афіцыйны статус гарадскога пасёлка. У гады другой сусветнай вайны з 15 жніўня 1941 да 26 верасня 1943 года Хоцімск знаходзіўся пад нямецкай акупацыяй. Хоцімск—першы раённы цэнтр Магілёўскай вобласці, які быў вызвалены савецкімі войскамі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1994 годзе афіцыйна зацверджаны герб і сцяг Хоцімска.

